**Рэгламент мерапрыемства пад назвай**

**«Дзень дзяцей – Моц слоў»**

**(далей: «Рэгламент»)**

1. Мерапрыемства мае адукацыйна-мастацкі характар.
2. Мерапрыемства адбудзецца 31 мая 2026 года з 11:00 да 15:00. Арганізатарам мерапрыемства з’яўляецца Музей гісторыі польскіх яўрэяў POLIN, вул. Анялевіча 6, 00-157 Варшава, тэл. 22 471 03 01, www.polin.pl; электронная пошта: polin@polin.pl.
3. Каб узяць удзел у мерапрыемстве, небаходна азнаёміцца з наступным Рэгламентам і прытрымлівацца яго палажэнняў. Невыкананне ніжэйпрыведзеных правілаў можа прывесці да выкліку адпаведных службаў парадку для выдалення ўдзельніка мерапрыемства або прыняцця іншых мер, накіраваных на тое, каб спыніць парушэнне Рэгламенту.
4. Уваход на тэрыторыю, дзе праводзіцца мерапрыемства, азначае прынящце Рэгламенту. Прынящце Рэгламенту з’яўляецца неабходным для ўдзелу ў мерапрыемстве.
5. Мерапрыемства з’яўляецца агульнадаступным і бясплатным. Непаўналетнія асобы могуць удзельнічаць у мерапрыемстве толькі ў прысутнасці паўналетняга апекуна, які нясе адказнасць як за ўласныя дзеянні, так і за шкоду або няшчасныя выпадкі, учыненыя непаўналетнімі, што знаходзяцца пад яго апекай.
6. Мерапрыемства складаецца з наступных актыўнасцяў (далей: "мерапрыемствы"): сямейныя майстар-класы, гульні на свежым паветры, зона для малых дзяцей з сэнсарнымі анімацыямі, наведванне пастаяннай экспазіцыі з гульнёй «Таямнічы музей», наведванне часовай выставы з гульнёй «Літарнае галавакружэнне», сямейныя анімацыі на Пляцоўцы сямейнай адукацыі «У караля Мацюся», гастранамічная зона, зона адпачынку. Асобы, якія ўдзельнічаюць у мерапрыемстве, абавязаныя

выконваць указанні і інструкцыі прадстаўнікоў Арганізатара, якія праводзяць мерапрыемствы.

7. Жывёлы могуць знаходзіцца на тэрыторыі мерапрыемства толькі пад наглядам уладальніка пад яго адказнасць, калі яны не перашкаджаюць правядзенню мерапрыемства і ўдзелу ў ім.
8. Знаходжанне на тэрыторыі мерапрыемства асоб, якія знаходзяцца пад уздзеяннем алкаголю, наркатычных сродкаў або іншых аналагічных рэчываў, забаронена. Таксама забараняецца ўжыванне алкагольных напояў, ужыванне наркатычных сродкаў або іншых аналагічных рэчываў на тэрыторыі правядзення мерапрыемства.
9. На тэрыторыі правядзення мерапрыемства строга забараняецца курэнне тытуню, унясенне любых небяспечных матэрыялаў або прадметаў, у прыватнасці зброі, петард, бенгальскіх агнёў, фаераў, нажоў, а таксама выкарыстанне адкрытага агню.
10. На тэрыторыі мерапрыемства забараняецца пакідаць смецце, рэшткі ежы і напояў у месцах, не прызначаных для гэтага.
11. Паведамляем, што падчас мерапрыемства будуць зробленыя фотаздымкі і відэазапісы, якія будуць публікавацца ў сацыяльных сетках Музея (у тым ліку Facebook, Instagram) і на інтэрнэт-старонках Музея ў рэкламных мэтах.
12. Забараняюцца любыя непрыстойныя паводзіны, выкарыстанне абразлівай і прыніжальнай лексікі, распаўсюджванне і вывешванне лозунгаў непрыстойнага, вульгарнага, расісцкага або іншага характару, якія парушаюць або могуць парушаць асабістыя правы і агульнапрынятыя нормы, распальванне канфліктаў на нацыянальнай, рэлігійнай або сацыяльнай аснове, палітычная агітацыя, а таксама любыя паводзіны, што супярэчаць грамадскім і маральным нормам.
13. Забараняецца пашкоджанне, знішчэнне або крадзеж прадметаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі мерапрыемства.

14. Службы парадку Арганізатара і гарадскія праваахоўныя органы маюць права выдаліць з тэрыторыі мерапрыемства парушальнікаў палажэнняў Рэгламенту, або прыняць іншыя адпаведныя меры для спынення парушэнняў.
15. Тэрыторыя мерапрыемства пастаянна кантралюецца. У выпадку выяўлення пагрозы ўдзельнікі мерапрыемства павінны:

▪ неадкладна паведаміць службам парадку або інфармацыйным службам пра пагрозу:

(22) 471 03 25 – АХОВА МУЗЕЯ

112 – ЦЭНТР АВАРЫЙНАЙ АБВЕСТКІ

986 – ГАРАДСКАЯ СЛУЖБА (723 986 112 – SMS для экстранных паведамленняў)

997 – ПАЛІЦЫЯ

998 – ПАЖАРНАЯ СЛУЖБА

999 – ХУТКАЯ ДАПАМОГА

▪ выконваць інфармацыйныя паведамленні і ўказанні, якія даюць службы парадку і інфармацыі,

▪ не перашкаджаць праезду ратавальных службаў.

16. Арганізатар не нясе адказнасці за дзеянні трэціх асоб, якія ажыццяўляюць дзейнасць у ваколіцах мерапрыемства, у тым ліку за прапанаваныя імі паслугі або дастаўкі.
17. Правілы мерапрыемства размешчаны на сайце www.polin.pl і даступныя ў інфармацыйным пункце мерапрыемства. Арганізатар пакідае за сабой права ўносіць змены ў Рэгламент.